УДК 94(474/476)ВКЛ

# ПРАВАВЫ СТАТУС ТЫТУЛАЎ СВЯТОЙ РЫМСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

***Павел Булаты***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца прававы статус ганаровых тытулаў, якія прадстаўнікі магнатэрыі Вялікага Княства Літоўскага атрымалі ад імператара Святой Рымскай імперыі. Увага надаецца вызначэнню ролі тытулаў у грамадстве, прававая трансфармацыя іх статусу.

***Ключавыя словы: шляхта, тытулы, прававы статус, Святая Рымская імперыя***

З’яўленню тытулаў Святой Рымскай імперыі ў Вялікім Княстве Літоўскім спрыялі знешнепалітычныя стасункі дзяржавы на тле міжнароднай абстаноўкі, якая сфармавалася ў першай палове XVI стагоддзя. Гэты перыяд ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага быў запоўнены войнамі і жорсткім супрацьстаяннем з Вялікім Княствам Маскоўскім. У канфліктах розных гадоў (1500–1503, 1506–1508, 1512–1522, 1534–1537) адзначаюцца перамогі і паразы як з аднаго, так і з другога боку. Пад час гэтага супрацьстаяння Масква імкнулася атрымаць падтрымку Святой Рымскай імперыі германскай нацыі. У саюзе са Святой Рымскай імперыяй было зацікаўлена і Вялікае Княства Літоўскае. У сувязі з гэтым, перыяд першай паловы XVI стагоддзя адзначаецца шчыльнымі і складанымі дыпламатычнымі стасункамі паміж імперыяй і Княствамі Літоўскім і Маскоўскім.
У гэты час адзначаюцца шматлікія дыпламатычныя кантакты паміж вялікім князем Жыгімонтам і імператарам Максіміліянам па справах адносін з Масквой [1]. Дзеля падтрымання выгадных для сябе адносін з імперыяй Вялікае Княства Літоўскае вядзе шчыльнае дыпламатычнае супрацоўніцтва з германскім дваром, дзе значную ролю адыгрываюць асобы паслоў. Як адзначае Р. Пятраўскас, пачынаючы з XV ст. удзел у пасольствах бяруць часцей за ўсё найбольш уплывовыя асобы краіны, якія займалі важныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім і належалі да знаці [2]. За мяжой пасол з’яўляўся адлюстраваннем свайго гаспадара, яго асабістым прадстаўніком. Пасол выконваў разнастайныя даручэнні ўладара, але падчас сваёй місіі ад стасункаў з прадстаўнікамі дзяржавы, куды было накіраванае пасольства, дыпламат мог атрымаць і ўласныя выгады. Так, у першай палове XVI ст. дыпламаты, якія накіроўваліся да двара Святой Рымскай імперыі мелі магчымасць атрымаць для сябе і свайго роду пэўны тытул – княжацкі, графскі.

Першым у Вялікім Княстве Літоўскім тытул князя Святой Рымскай імперыі атрымаў канцлер Мікалай Мікалаевіч Радзівіл па мянушцы Amor Poloniae. 25 лютага

ПолесГУ

1518 г. імператар Максіміліян выдаў адмысловы княжацкі дыплом на тытул «*князь на Гонядзі і Мядзелі*» [3]. У тым жа годзе вялікі князь Жыгімонт І легітымізаваў наданне Радзівілу тытулу сваім прывілеем [4]. Наступным у 1530 г. тытул Святой Рымскай імперыі «*Comitis in Murala Geranoini* [5, с. 35]» – графа з Мураваных Геранёнаў – атрымаў Альбрэхт Гаштольд.

Аднак старэйшая княжацкая галіна роду Радзівілаў праіснавала не доўга і неўзабаве згасла. Нанова княжацкі тытул Радзівілы займелі ў 1547 г. Так, 10 снежня 1547 г. прывілей з тытулам «*князь на Біржах і Дубінках*» ад імператара Святой Рымскай імперыі Карла V атрымаў Мікалай Радзівіл Руды [6]. Пазней гэты тытул перадаваўся нашчадкам Мікалая Радзівіла Рудога па біржанскай лініі роду. 14 снежня 1547 г. дыплом і тытул «*князь на Алыцы і Нясвіжы*» ад імператара атрымаў Мікалай Радзівіл Чорны. Тытулы, атрыманыя Радзівіламі, былі зацверджаныя вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Аўгустам 25 студзеня 1549 г. адпаведным прывілеем [7]. Мікалай Радзівіл Чорны 10 ліпеня 1553 г. атрымаў ад караля Фердынанда і тытул «*граф на Шыдлоўцах*» [8].

Аднaчасова з Радзівілам у 1553 г. тытул «*граф на Міры* [9]» ад караля Фердынанда атрымаў Юры Шчаснавіч Іллініч – апошні прадстаўнік роду Іллінічаў «па мячы». У 1555 г. тытулам «*граф на Шклове і Мышы*» у асобе Гераніма Хадкевіча быў уганараваны род Хадкевічаў [10, арк. 199-201]. З 1569 г. прадстаўнікі галіны роду Тышкевічаў, пачынаючы ад Васіля Тышкевіча, маюць тытул «*граф на Лагойску і Бярдзічаве*» [11, с. 55].

Такім чынам, у перш. пал. XVI ст. носьбітамі замежных тытулаў сталі пяць родаў: Радзівілы, Гаштольды, Іллінічы, Хадкевічы, Тышкевічы. Зыходзячы з тэкстаў велікакняжацкіх прывілеяў, якімі зацвярджаўся замежны тытул, яго наданне можна акрэсліць як высокую ўзнагароду і прызнанне заслуг роду і асобы. Так, у прывілеях адзначаецца, што тытул надаецца за вайсковыя, дзяржаўныя, гаспадарчыя справы. Асаблівая ўвага надавалася ўдзелу носьбіта тытулу ў пасольствах [7, 10, 11].

Аднак з’яўленне замежных тытулаў адразу выклікала супярэчанні ў грамадстве Вялікага Княства Літоўскага, што абмяркоўвалася на Берасцейскім сойме 1518 г. Звязана гэта з тым, што да прэцэдэнту атрымання замежнага тытулу Радзівілам, права на княжацкі тытул мелі толькі спадчынныя князі па крыві (Рурыкавічы, Гедымінавічы). Прыняцце замежнага тытулу ўводзіла новы звычай, які парушаў існуючы лад і роўнасць шляхецкага саслоўя [12, с. 20]. Дазвол на атрыманне тытулу павінен быў даць вялікі князь [13, с. 212], што і адбылася ў выпадку з Мікалаем Радзівілам, а таксама назіралася далей з іншымі прадстаўнікамі роду Радзівілаў, Іллінічаў, Хадкевічаў, Тышкевічаў.

Прававы статус тытулаў быў акрэслены на Люблінскім сойме 1569 г. Адпаведна з прынцыпам шляхецкай роўнасці наяўнасць канкрэтнага тытулу не надавала пэўнага прывілеяванага становішча ў грамадстве. Адной з характэрных рыс саслоўнай кансалідацыі і шляхецкай роўнасці стала скасаванне арыстакратычных і спадчынных тытулаў. Выключэннем сталі тыя тытулы (старажытныя княжацкія і замежныя), што былі прынятыя раней і дапускаліся Люблінскім соймам [14, с.71; 15, с. 442; 16, с. 25; 17, с. XXI].

Пытанне, звязанае з замежнымі тытуламі і іх статусам, неаднаразова падымалася на соймах XVII ст. Так, у канстытуцыі вальнага сойму 1638 г., спасылаючыся на прынцып роўнасці, адзначаецца, што любых тытулаў (позніх ці старых) ніхто прымаць і прасіць не можа. Але акрэсліваецца, што тытулы, дапушчаныя Люблінскім соймам, захоўваліся [15, с. 441-442].

Зноў пытанне тытулатуры падымалася на сойме 1641 г. У яго канстытуцыі адзначаецца, што мінулы акт 1638 г. застаецца ў моцы. У адрозненні ад мінулай пастановы, раскрываўся і тлумачыўся статус існуючых у дзяржаве тытулаў: тыя тытулы, якія прымаліся Люблінскім соймам і замацоўваліся княжацкімі прывілеямі, захоўваліся. Вызначаўся і сацыяльны статус іх носьбітаў: яны прыраўноўваліся да шляхецкага стану [18, с. 8-9].



ПолесГУ

Разглядалася пытанне ганаровай тытулатуры на сойме 1673 г. У адрозненні ад пастаноў 1638 і 1641 г., у пастанове 1673 г. гаворка вялася пра забарону новых замежных тытулаў і спадарожных з імі атрыбутаў. Канстытуцыяй адмяняліся тытулы – князь, граф і любыя іншыя, а таксама гербы і пячаці, звязаныя з імі. Адзначалася, што ніхто не мог прыўносіць і выкарыстоўваць замежных тытулаў, каб не парушаць роўнасць шляхецкага стану. Аднак, як і акрэслівалася ў мінулых канстытуцыях, ранейшыя, ужо існуючыя тытулы не парушаліся [19, с. 73].

Пытанне, звязанае з тытуламі, акрэслівалася ў Pacta conventa (ўсеагульныя пагадненні), якія заключаліся паміж шляхтай Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага і новаабраным манархам перад яго уступленнем на прастол. У дакуменце адзначалася і падкрэслівалася роўнасць шляхецкага саслоўя, а таксама дэкларавалася недапушчальнасць перагляду роўнасці тытулаванымі родамі – графскім, маркграфскімі, княжацкімі. Дзеля забеспячэння гэтага, манарх не меў магчымасці раздаваць родавыя тытулы [20, с. 97].

Аднак не гледзячы на гэта, каралём Станіслававам Аўгустам Пнятоўскім былі парушаныя Pacta conventa і мінулыя канстытуцыі сойму. Так, у 1764 г. манарх адпісаў свайму брату Казіміру Панятоўскаму княжацкі тытул [20, с. 160]. У хуткім часе, па прыкладзе каралеўскай сям'і, тытул князя сабе здабылі прадстаўнікі роду Сапегаў, а таксама прадстаўнікі шэрагу родаў Кароны Польскай [20]. Адзначым, што ў пастанове, звязанай з наданнем княжацкага тытулу Сапегам, прысутнічае спасылка нібыта на прывілей Жыгімонта I ад 1512 г., які надаваў роду княжацкі тытул (сам дакумент, унесены ў 1744 г. у Метрыку, лічыцца фальсіфікатам [21]). Гэта стварала ўмовы, пры якіх фармальна новы тытул не надаваўся, толькі пацвярджаўся даўно нададзены [20, с. 377], што адпавядала канстытуцыям сойму 1638, 1641, 1673 гг. і рабіла законным наданне княжацкага тытулу Сапегам.

На хвалі ўганаравання новых родаў княжацкім тытулам сойм у 1775 г. легалізуе і дазваляе атрыманне тытулаў Святой Рымскай імперыі. Адбылося гэта па пратэкцыі аўстрыйскага двара. У канстытуцыі адзначаецца, што тытул князя Святой Рымскай імперыі прызнаецца ў Рэчы Паспалітай і яе падданыя могуць яго атрымліваць. Аднак падкрэсліваецца, што тытулы не будуць несці якіх-небудзь прэрагатыў і парушаць шляхецкай роўнасці [22, с. 112].

Такім чынам, грунтуючыся на адзначаных вышэй пастановах, можна сцвярджаць, што ў праваых і сацыяльных аспектах наяўнасць тытулу з'яўлялася фармальнасцю, якая ў рэчышчы панавання прынцыпу шляхецкай роўнасці не надавала тытулаванай асобе якіх-небудзь пэўных прэрагатыў. Нягледзячы на фармальнасць тытулу і адсутнасць сацыяльных прэферэнцый ад яго наяўнасці, іх носьбіты працягвалі прытрымліваца ганаровай тытулатуры. Звязана гэта з працэсам вылучэння у асяроддзі шляхты магнацкай праслойкі, якая з часам склала эліту грамадства. Тытул, як рэдкі атрыбут, рабіў магната адметным ад іншых прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя і, хай фармальна, ўзвышаў у саслоўнай лесвіцы, а таксама надаваў вонкавага лоску тытулаванаму двару, што падкрэслівала магнацкую выключнасць.


1. Дзярновіч, А. Метрыка ВКЛ аб адносінах Вялікага княства Літоўскага і Святой Рымскай імперыі / Алег Дзарновіч // Беларускі гістарычны часопіс 4 (12), 1995. – С. 90–99.
2. Пятраўскас, Р. Літоўская знаць кан. XIV–XV ст.: Склад – структура – улада / Рымвідас Пятраўскас; пераклад з літоўскай мовы Алесь Мікус. – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 386 с.
3. Archiwum Główne Akt Dawnych. – AR. Dz. I. Perg. 7486.
4. Archiwum Główne Akt Dawnych. – AR. Dz. I. Perg. 7550.
5. Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам : Ч. 1. – Вильно : тип. А. Марциновского, 1843. – 194 с.
6. Górzyński, S. Rodzina radziwiłłów i ich tytuły / Sławomir Górzyński // Radziwiłłowie herbu Trąby. – Warszawa : DiG, 1996. – S. 45 – 50.


ПолесГУ

7. Archiwum Główne Akt Dawnych. – AR. Dz. I. Perg. 8426.
8. Archiwum Główne Akt Dawnych. – AR. Dz. I. Perg. 8391.
9. Archiwum Główne Akt Dawnych. – AR. Dz. I. Perg. 7695.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 50.
11. Lietuvos metrika. Kn. Nr 49, (1566-1572) : Užrašymų knyga 49 / Parengė Eglė Deveikytė. – Vilnius : Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2014. – 178 p.
12. Скеп’ян, Н. Закладанне родавых традыцый на прыкладзе Мікалая Мікалаевіча Радзівіла / Н. Скеп’ян // ARCHE Пачатак №6, 2015. – С. 10–24.
13. Любавский, М. К. Литовско-русский Сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства / М.К. Любавский. – Москва : 1900. – 1160 с.
14. Дневник Люблинского сейма 1569 г. Соединение Великого Княжества Литовского с Королевством Польским / Под ред. М. О. Кояловича. – СПб., 1869.
15. Volumina Legum. T. III. – Petersburg, 1859.
16. Bernatowicz, T. Mitra i buława. Królewskie ambicje książąt w sztuce Rzeczypospolitej szlacheckiej (1697-1763) / Tadeusz Bernatowicz. – Warszawa : Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 2011. – 557 s.
17. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / Józef Wolff. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1895.
18. Volumina Legum. T. IV. – Petersburg, 1859.
19. Volumina Legum. T. V. – Petersburg, 1860.
20. Volumina Legum. T. VII. – Petersburg, 1860.
21. Грыцкевіч, А. Старонкі нашай мінуўшчыны / А. Грыцкевіч. – Мінск: Кнігазбор, 2009. – 468 с.
22. Volumina Legum. T. VIII. – Petersburg, 1860.
Полесгу